**УДК 398.324(=161.3)“19/20”:930.1**

# ТРАДЫЦЫІ КУЛЬТУРЫ ЛЕСАКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСАЎ У XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

***А.Ю. БАБІЧ***
***(Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, Мінск)***

*На падставе разгляду шэрага этнаграфічных прац, а таксама даследаванняў па фальклоры, этнабатаніцы, лесазнаўстве і іншым напрамкам аўтар вызначае асноўныя этапы і напрамкі ў вывучэнні праблемы. Беларуская этналогія назапасіла багаты фактычны матэрыял па праблеме традыцыйнай культуры лесакарыстання беларусаў. У XX – пачатку XXI стагоддзя з’явіліся манаграфіі, артыкулы, прысвечаныя характарыстыцы прамысловых заняткаў беларусаў, у якіх знайшлі адлюстраванне пытанні, звязаныя з этнакультурнымі аспектамі лесакарыстання, працы, якія раскрываюць светапоглядныя ўяўленні беларусаў аб прасторы лесу. У сувязі з гэтым актуальнасць набывае вывучэнне гістарыяграфіі традыцый культуры лесакарыстання беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя з мэтай абагульнення інфармацыйнай базы па дадзенай тэме, а таксама далейшага вывучэння і тэарэтычнага асэнсавання праблемы.*

**Уводзіны.** Неабходнасць вывучэння ўнікальнага народнага вопыту ў сферы выкарыстання лясных рэсурсаў абумоўлена той роляй, якую на працягу стагоддзяў адыгрывала лясная прастора ў традыцыйнай сістэме прыродакарыстання беларусаў. І сёння лес складае амаль 40 % тэрыторыі Беларусі і з’яўляецца адным з базавых элементаў яе прыроднага ландшафту. Сістэма традыцыйных ведаў, маральна-этычных уяўленняў, нормаў і прынцыпаў паводзінаў у адносінах да прасторы лесу з’яўляецца карыснай для далейшага пошуку шляхоў гарманізацыі адносінаў у сістэме “чалавек – лес”. Айчынная этналогія назапасіла багаты фактычны матэрыял па праблеме традыцыйнай культуры лесакарыстання беларусаў. У XX – пачатку XXI стагоддзя з’явіліся манаграфіі, артыкулы, прысвечаныя характарыстыцы прамысловых заняткаў беларусаў, у якіх знаходзяць адлюстраванне пытанні, звязаныя з лесакарыстаннем, працы, у якіх раскрываюцца светапоглядныя ўяўленні беларусаў аб прасторы лесу. У сувязі з гэтым актуальнасць набывае даследаванне гісторыі вывучэння этнакультурных аспектаў лесакарыстання беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя з мэтай абагульнення інфармацыйнай базы па дадзенай тэме, а таксама далейшага вывучэння і тэарэтычнага асэнсавання праблемы.

**Асноўная частка.** У развіцці навуковай думкі па разглядаемай праблеме можна вылучыць чатыры асноўныя этапы.

***Першы этап*** ахоплівае перыяд з ***1901 па 1917 год***. Напачатку XX стагоддзя працягвалася інтэнсіўная праца па назапашванню, сістэматызацыі і публікацыі этнаграфічных матэрыялаў. Разам з вывучэннем духоўных традыцый беларусаў у дадзены перыяд у беларускай этнаграфіі паўстае новая плынь, звязаная з даследаваннем матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці беларусаў: “Калі ў канцы XIX ст. гэтаму пытанню прысвячаліся працы толькі некаторых этнографаў, то ў пачатку XX ст. з’яўляецца цэлая серыя даследаванняў і апісанняў” [1, с. 204].

Каштоўныя матэрыялы, якія датычацца культуры выкарыстання лясных рэсурсаў, утрымлівае трэці том этнаграфічнага зборніка П.В. Шэйна (1902). У кнізе змешчана даволі падрабязнае апісанне архаічнага ляднага земляробства, якім займалася ў Віцебскім павеце пераважна прышлае латышскае насельніцтва. Як адзначае карэспандэнт А.Ф. Лісоўскі, беларусы, “лядамі займаюцца між іншым” [2, с. 12 – 13]. Матэрыялы, сабраныя карэспандэнтамі П.В. Шэйна на Віцебшчыне і Гродзеншчыне, адлюстроўваюць маральна-этычныя аспекты адносінаў беларусаў да лесу і яго багаццяў [2, с. 20, 95]. У зборніку асобная ўвага нададзена характарыстыцы катэгорыі чараўнікоў, якія “пастаўленыя сваёй прафесіяй у сталыя і блізкія зносіны з той ці іншай стыхіяй” [2, с. 247 – 248]. Дадзеную катэгорыю чараўнікоў аўтар матэрыялаў, А.Е. Багдановіч, разглядаў падрабязней у сваёй працы “Пережитки древнего миросозерцания у белорусов” (1895) у раздзеле “Паслугачы нячыстай сілы”. Да прафесій, звязаных з магічнымі ведамі, Багдановіч адносіў занятак ляснічага, што тлумачылася сувяззю з лясной прасторай і, адпаведна, з міфалагічным гаспадаром дадзенага локуса – лесавіком. У кнізе апісаны магічныя дзеянні, накіраваныя на тое, каб задобрыць міфалагічнага ляснога гаспадара [3, с. 117 – 118]. Аўтар адзначаў, што веданне спецыяльных замоў у народным уяўленні забяспечвае ляснічаму асаблівае шчасце на паляванні [3, с. 118 – 120].

Сярод прац агульнапазнаваўчага зместу неабходна прыгадаць IX том навукова-папулярнага выдання “Россия: Полное географическое описание нашего Отечества” (1905), якое змяшчае абагульняючыя звесткі аб геаграфічных і прыродна-кліматычных умовах Беларусі, дае характарыстыку насельніцтва, заняткаў, эканомікі, шляхоў зносін і буйнейшых населеных пунктаў. У трэцім раздзеле працы “Раслінны і жывёльны свет” вызначаюцца асаблівасці ляснога покрыву, параўноўваюцца колькасныя паказчыкі лясных плошчаў у розных рэгіёнах, сцісла характарызуецца лясная флора (падаюцца навуковыя лацінскія і

мясцовая назвы раслін). Апісанне жывёльнага свету аўтары вядуць у параўнанні: “жывёлы ў даўніну” і “сучасны склад жывёльнага насельніцтва”, адзначаюць прычыны памяншэння колькасці жывёл у беларускіх лясах, а таксама іх распаўсюджанасць у асобных губернях. Раздзел змяшчае звесткі пра асаблівасці палявання і кошт на скуры жывёл (ліса, тхор, выдра, куніца, вавёрка) [4, с. 43 – 52]. Шосты раздзел працы “Промыслы і заняткі насельніцтва” ўтрымлівае каштоўныя матэрыялы па лядным земляробстве, лясным (калодным) пчалярстве, лясных і лесахімічных промыслах, прамысловых паляваннях [4, с. 242, 255 – 256, 274 – 275].

На магічныя аспекты палявання і сімвалічныя дзеянні ў лесе, накіраваныя на захаванне паляўнічай зброі ад чарадзейства і дасягненне поспеху ў промысле, адным з першых звярнуў увагу даследчык народнай культуры Беларускага Падзвіння М.Я. Нікіфароўскі ў кнізе “Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности” [5, с. 261 – 262]. У 1907 годзе выйшла яго праца “Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе” – першае сістэмнае навукова-папулярнае апісанне беларускай дэманалогіі. У строга вытрыманай і ўпарадкаванай сістэме дэманалагічных персанажаў знайшлося месца і міфалагічным насельнікам леса, якіх аўтар адносіць да катэгорыі чалавекападобных пазасядзібных нячысцікаў. Аўтар адзначае здольнасць лесавіка “перадаваць галасы ўсіх жыхароў свайго краю – ад мядзведжага рыку да піску камара ўключна” [6, с. 51], а таксама яго больш дзікі і няўмольны характар у параўнанні з нячысцікамі сядзібнымі.

Асобныя аспекты і праблемы выкарыстання лясных рэсурсаў разглядае ў сваіх працах вядомы этнограф А.К. Сержпутоўскі. Характарызуючы змены ў быце жыхароў Палесся ў этнаграфічным нарысе “Беларусы-палешукі: Пабудовы, заняткі і павер’і сялян паўночнай паловы Мазырскага і паўднёвай часткі Слуцкага паветаў Мінскай губерні” (праца захоўваецца ў рукапісу), аўтар адзначае, што ў паслярэформенны час значная частка насельніцтва Палесся закінула сваю гаспадарку і занялася лесараспрацоўкамі, аднак да пачатку ХХ стагоддзя, калі будаўнічы лес быў па-драпежніцку знішчаны і лесараспрацоўкі спынены, сяляне вымушаны былі зноў вярнуцца на сваю гаспадарку, якая раней была закінута і заняпала [1, с. 225]. Раздзел “Заняткі і промыслы” змяшчае характарыстыку лясных промыслаў, бортніцтва, апісанне збору ягад, грыбоў, арэхаў і г.д. У публікацыі А.К. Сержпутоўскага “Нарысы Беларусі: Запасаванне гаўяда” (1908) разглядаюцца такія віды пабочнага лесакарыстання, як выпас жывёлы і нарыхтоўка сена ў лясных масівах, што былі надзвычай распаўсюджаны на Беларускім Палессі. Значную каштоўнасць для вывучэння традыцый лесакарыстання мае даследаванне А.К. Сержпутоўскага, прысвечанае бортніцтву [7]. Пасля сціслай характарыстыкі прыродна-геаграфічных умоў Беларускага Палесся напачатку працы (ландшафт, глеба, клімат, тыпы лясоў і г.д.) аўтар адзначае асаблівую ролю промыслаў у жыцці мясцовага насельніцтва, у тым ліку заняткаў, звязаных з выкарыстаннем лясных рэсурсаў (“звералоўства”, збіральніцтва грыбоў і ягад, нарыхтоўка, вываз і сплаў лясных матэрыялаў, бортніцтва, нарыхтоўка кары і інш.). На падставе матэрыялаў, сабраных А. К. Сержпутоўскім напрыканцы XIX стагоддзя і падчас экспедыцый 1906 – 1910 гадоў, зроблена дэтальнае апісанне прыёмаў і прылад, якімі карысталіся беларусы пры развядзенні дзікіх і хатніх пчол (праілюстраванае замалёўкамі, чарцяжамі, фотаздымкамі), звяртаецца ўвага на працэс тэхналагічнага ўдасканальвання пчалярства. Акрамя матэрыяльных аспектаў промыслу, разглядаюцца некаторыя павер’і беларусаў, звязаныя з пчоламі і пчалярствам (бортніцтвам) у цэлым. Даследчык заўважае, што ў канцы XIX – пачатку ХХ стагоддзя бортніцтва прыходзіць у заняпад і вызначае прычыны гэтага працэсу.

Варта адзначыць, што ў этнаграфічных працах канца XIX – пачатку ХХ стагоддзя закранаюцца экалагічныя праблемы, звязаныя з культурай выкарыстання лясных багаццяў. Так, напрыканцы XIX стагоддзя М.Я. Нікіфароўскі ў кнізе “Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности” (1895) падкрэслівае значнае скарачэнне лясных масіваў увогуле, і асабліва прыгоднага для будоўлі лесу, памяншэнне колькасці дзікіх жывёл [5, с. 466].

Праблема скарачэння агульнай плошчы лясоў і пагаршэння іх якасці гучыць у працы, падрыхтаванай і выдадзенай у 1910 годзе Статыстычным аддзелам Віцебскай губернскай управы: “… яшчэ больш, чым памяншалася колькасць лясоў, пагаршалася іх якасць. Узмацнёная і, большай часткай, драпежная эксплуатацыя лесу з уладальнікамі, якія часта змяняліся, прывяла да таго, што захаваныя векавыя лясы з вялікімі каштоўнымі таварнымі дрэвамі, у прыватнаўласніцкіх маёнтках сустракаюцца як рэдкае выключэнне” [8, с. 14]. Аўтары не толькі канстатавалі праблему, але і вызначалі яе прычыны. Першы раздзел змяшчае звесткі прыродазнаўчага характару: сціслая характарыстыка клімату, флоры і фаўны, лясных парод, сістэмы рэк (падкрэсліваецца іх асаблівая карыснасць пры транспарціроўцы лесу і лясных матэрыялаў). Даследаванне прадстаўляе цікавасць і тым, што ўключае матэрыялы перапісу 1907 года, якія дэтальна распрацаваны ў форме табліц. Нягледзячы на тое, што асноўная ўвага акцэнтуецца на земляробчы занятак, у табліцах і тэксце нарыса выкладзены дадзеныя, якія даюць уяўленне аб некаторых колькасных паказчыках удзелу насельніцтва ў промыслах, звязаных з выкарыстаннем лясных рэсураў (“лясны промысел”, пчалярства, паляванне), а таксама аб катэгорыях і колькасці лясных служачых (егер, лоўчы, ляснічы, лесааб’ездчык, лясны вартаўнік).

У восьмым томе “Белорусского сборника” Е.Р. Раманава, які выйшаў у 1912 годзе, лясныя промыслы вызначаюцца як адзін з асноўных заняткаў беларусаў, таксама ўздымаецца праблема вынішчэння лясоў у сувязі з актыўнай распрацоўкай лясных багаццяў, у выніку чаго “промыслы гэтыя зменшыліся альбо зніклі” [9, с. 3 – 4]. У першым раздзеле, прысвечаным вытворчай дзейнасці, асобная ўвага надаецца такім старажытным промыслам беларусаў, як бортніцтва і збіральніцтва. Некаторыя народныя вераванні адносна лесу і лесакарыстання, што фарміраваліся ў працэсе гаспадарчай дзейнасці беларусаў, сустракаюцца ў другім (“Народны каляндар”) і трэцім (“Народныя вераванні”) раздзелах зборніка. Сярод звестак, якія адлюстроўваюць сувязь лесакарыстання з каляндарнай абраднасцю беларусаў, павер’е пра свята Узвіжанне: “У гэты дзень усе змеі вядомага лесу – “здзвігаюцца” ў адно месца і адсюль хаваюцца на зіму па норах. Таму імкнуцца ў гэты дзень у лес не хадзіць” [9, с. 278], а таксама сведчанне пра забарону хадзіць у лес на Русальны тыдзень.

Цікавасць грамадскасці да гаспадарчай дзейнасці і побыту, а таксама вераванняў і ўяўленняў беларускага сялянства пра навакольны свет у дадзены перыяд праявілася ў значнай колькасці артыкулаў, змешчаных на старонках беларускага, а таксама рускага і польскага перыядычнага друку.

Асобныя пытанні па культуры лесакарыстання беларусаў закраналіся ў часопісе “Могилёвские губернские ведомости” (1902, 1903). Прыкметы і павер’і, звязаныя з вызначэннем ураджаю грыбоў, ягад і арэхаў на наступны год, утрымліваюць матэрыялы Е.Р. Раманава: “Калі будуць зоркі на першую Каляду, то будуць грыбы, як жыта пасяваць, а калі на апошнюю, тады будуць, як авёс высыпаць (альбо: восеньскія грыбы)” [10, с. 67]. У раздзел, прысвечаны народнай медыцыне беларусаў, уключаны запісы адносна лекавых сродкаў жывёльнага і расліннага паходжання, здабываемых у лесе [10, с. 107 – 112].

Сярод рускамоўных выданняў гэтага перыяду трэба адзначыць часопіс “Живая старина” аддзялення этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства, у якім друкаваліся і беларускія аўтары. У адным з артыкулаў даследчык народнай культуры беларусаў Смаленшчыны Ул.М. Дабравольскі падрабязна характарызуе сістэму рытуальных прадпісанняў, звязаных з лесам (“Живая старина”, 1908). Аўтар пазначае, што ўваходу ў лес, як правіла, папярэднічаў зварот-просьба да ляснога гаспадара, прыводзіць апісанне абраду “адведвання”, які павінен быў спрыяць вяртанню дамоў заблукалых у лесе людзей, а таксама жывёлы [11, с. 9].

Надзвычай карыснай для вывучэння народных уяўленняў і вераванняў, звязаных з паляўнічым промыслам, з’яўляецца публікацыя В. Шукевіча ў перыядычным польскім выданні “Wisla” [12], якая змяшчае прыкметы на ўдалае паляванне і засцерагальныя прадпісанні, магічныя прыёмы ўдасканалення стрэльбы (“каб стрэльба не жывіла”) і спосабы шкоднага ўплыву на паляўнічую долю.

У артыкуле польскага аўтара В. Налкоўскага “Палессе” (часопіс “Земя”, 1912), прысвечанага пераважна геаграфіі і прыродзе беларускага Палесся, апісаны лясны промысел збірання яек качак, які практыкаваўся вясной усёй вясковай грамадой. Лесахімічнымі промысламі, па сведчанню аўтара, у рэгіёне займаліся пераважна буднікі – мазуры, сядзібы якіх сярод лесу, сляды іх дзейнасці мясцовыя жыхары называлі майданамі [13, с. 59].

Такім чынам, даследаванні, якія адлюстроўваюць пэўныя аспекты культуры лесакарыстання беларусаў, у пазначаны перыяд насілі пераважна апісальны характар, у той час у іх “…своечасова фіксаваліся ў асноўным тыя элементы быту і культуры народаў, якія беззваротна адыходзілі ў мінулае [1, с. 204]. Трэба адзначыць, што звесткі па дадзенай праблематыцы з’яўляюцца ў крыніцах 1901 – 1917 гадоў фрагментарна. Бадай адзінай працай, аб’ектам вывучэння якой выступае культура лесакарыстання беларусаў, з’яўляецца даследаванне А.К. Сержпутоўскага “Бортніцтва ў Беларусі”.

***Другі этап*** развіцця навуковай думкі па даследуемай праблеме ўключае ***1920 – 1930-я гады.*** Як і папярэдні ён характарызуецца галоўным чынам збіральніцкай дзейнасцю.

Вялізнай колькасцю фактычнага матэрыялу, дакладнасцю і аб’ектыўнасцю ў перадачы звестак вылучаецца зборнік А.К. Сержпутоўскага “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (1930) [14] – вынік шматгадовай збіральніцкай дзейнасці аўтара на Случчыне. Што тычыцца матэрыялаў па лесакарыстанню беларусаў, то яны прадстаўлены разрознена ва ўсіх пяці частках кнігі. Сярод іншых трэба адзначыць раздзелы: “Расліна”; “Земляробства ці гаспадарка” (прыкметы на будучы ўраджай грыбоў, ягад, арэхаў на наступны год); “Падарожнасць” (правілы паводзінаў у лясной прасторы); “Установы ў працягу года” (лясныя карыстанні ў сістэме народнага календара); “Парады й перасцярогі” (парады на шчаслівае паляванне, спосабы лячэння змяінага ўкусу; перасцярогі ад ваўкоў); “Людзі-духі” (прыёмы паляўнічай магіі). Пытанні выкарыстання прасторы лесу і яе рэсурсаў у народнай медыцыне разглядаюцца ў раздзеле “Лекі ад усякіх хвароб”. Такім чынам, нягледзячы на апісальны характар працы, яна з’яўляецца карыснай крыніцай у вывучэнні традыцый лесакарыстання беларусаў.

Асобныя аспекты культуры лесакарыстання беларусаў закранае ў сваіх даследаваннях І.А. Сербаў. У працы, прысвечанай матэрыяльнай культуры беларусаў так званай Вічынскай зямлі, падаюцца невялікія па аб’ёме звесткі пра збор грыбоў і ягад, паляванне, пчалярства ў пазначаным рэгіене [15, с. 70 – 72]. Аўтар адзначае асаблівую “таемнасць” пчалярства, а таксама вялікую колькасць магічных дзеянняў у дадзенай справе.

Асаблівае значэнне ў раскрыцці значэння прамысловых заняткаў, звязаных з лесам, у сялянскай гаспадарцы беларусаў Палесся маюць працы польскіх даследчыкаў Ч. Пяткевіча і К. Машынскага.

У 1928 годзе з’яўляецца адна з лепшых польскіх манаграфій па беларускай традыцыйнай прамысловай і сельскагаспадарчай культуры – работа Ч. Пяткевіча “Polesia Rzeczyckie. Kultura materialna” [16]. Кніга пачынаецца раздзелам “Збор дзікіх пладоў, іх спажыванне і кансерваванне”, які змяшчае каштоўнейшую інфармацыю па збіральніцтву. Акрамя характарыстыкі розных відаў грыбоў, ягад, траў, асабліваcцяў іх нарыхтоўкі, ужывання ў ежу, пазначаюцца некаторыя лекавальныя ўласцівасці дадзеных раслін. Па сведчанню аўтара, на Палессі пачатак масавага збору арэхаў і журавін вызначаўся пэўнымі каляндарнымі святамі (Спас, Уздзвіжанне). У гэтыя дні ўся вясковая грамада выходзіла ў лес для сумеснага збіральніцтва лясных дароў. У раздзеле, прысвечаным паляўніцтву, апісваецца зброя і спецыяльны рыштунак (торба, шратаўня, бабік, сані, лыжы і пяла), а таксама асаблівасці палявання на розных звяроў і птушак (дзікая каза, мядзведзь, лось, дзік, глушэц). Асобныя аспекты бортнага промыслу апісаны ў трэцім раздзеле кнігі.

У манаграфіі Ч. Пяткевіча “Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materjaly etnograficzne” (1938) вялікі раздзел складаюць народныя вераванні, звязаныя з насельнікамі лесу (вавёрка, глушэц, пугач і інш.). Падраздзел “Паляўнічыя чары” змяшчае апісанні магічных сродкаў уздзеяння на зброю і промысел у цэлым. У дадзенай працы ўпершыню падрабязна разглядаецца вобраз майстара (атамана) смалакурні, адзначаюцца яго звышнатуральныя здольнасці, якія ён атрымоўваў, па народных уяўленнях, праз сувязь з “чортам смаляным”. У падраздзеле “Чары” апісаны абрад стварэння спецыяльнага абярэга, які павінен ахоўваць хатнюю жывёлу, што пасецца ў лесе, ад ваўкоў. Стаўленне палешукаў да ўласнасці на лес і зямлю адлюстравана ў падраздзеле “Кража” ўцалелага фрагмента трэцяй, не апублікаванай Ч. Пяткевічам, кнігі “Грамадская культура”.

На якасна новым навуковым узроўні разглядаецца народная культура лесакарыстання ў манаграфіі Казіміра Машынскага “Polesie Wschodnie” (1928) [18], матэрыялы да якой былі сабраны ім падчас экспедыцыі 1914 года ў Рэчыцкім і Мазырскім паветах Мінскай губерні. Даследаванне з’яўляецца першай спробай даследавання беларускай матэрыяльнай культуры на этналагічным узроўні. У выкладанні матэрыялу К. Машынскі верны эвалюцыйнаму падыходу – ён пачынае з самых старажытных заняткаў (збіральніцтва, паляўніцтва і рыбалоўства) і заканчвае характарыстыкай рамёстваў.

У раздзеле, прысвечаным збіральніцтву, К. Машыньскі апісвае асноўныя віды раслін, ягад і грыбоў, якія збіралі палешукі, прыводзіць іх беларускія і лацінскія назвы [18, с. 23 – 25].

Даволі вялікі падраздзел даследчык прысвяціў паляўніцтву. Акрамя агульных звестак па гэтым промысле, аўтар вызначае асаблівасці палявання на мядзведзя, ваўка, куніцу, гарнастая, тхара, выдру, зайца, лася, птушак.

Падраздзел па пчалярству пачынаецца з разгляду бортніцтва, а дакладней – з апісання прыручэння дзікага пчалінага рою. У працы падрабязна апісаны “лезіва” (“лезьва”), працэс лазання на бортнае дрэва, іншыя прылады працы бортніка, працэс “тварэння борці” [18, с. 38 – 40]. Бортных знакаў на Палессі, паводле К. Машынскага, не ведалі – кожны добра памятаў як свае, так і борці суседзяў. Заканчваецца падраздзел апісаннем прыстасаванняў для абароны борцяў і вулляў ад мядзведзяў [18, с. 41 – 48].

Трэці раздзел работы К. Машынскага, які мае назву “Выраб прылад, рэчаў, адзення і пабудоў”, пачынаецца падраздзелам, прысвечаным агульным звесткам па дрэваапрацоўчым рамёствам, у тым ліку аўтар характарызуе розныя пароды дрэў і іхняе прызначэнне. Асобна разглядаецца адзін з відаў лесахімічных промыслаў – смалакурэнне. Аўтар закранае таксама працэс вырабу дзёгцю.

Значную карысць у даследаванні гаспадарчых заняткаў, звязаных з лесам, мае праца К. Машынскага “Kultura ludowa slowian” (1929, 1967) [19], у якой істотнае месца займаюць матэрыялы з Беларусі. Даследаванне матэрыяльнай культуры славянскіх народаў аўтар пачынае з разгляду стратэгій жыццязабеспячэння, змешчанага ў раздзеле “Здабыча ежы і сыравіны”. У першым падраздзеле, прысвечаным збіральніцтву, аўтар паведамляе пра перыядычнае выкарыстанне ў ежу беларусамі падкоркавай белі бярозы і асіны, маладых парасткаў сасны, а ў некаторых рэгіёнах Беларусі – воднай манны (Glyceria fluitaus) [13, с. 87]. У заключнай частцы падраздзела паведамляецца пра прылады і посуд, якія выкарыстоўвалі для збору ягад і грыбоў (матыкі, чарпакі, кошыкі, вазы).

Пры апісанні паляўнічага промыслу аўтар характарызуе розныя спосабы палявання (падкрадванне, наўздагон, засада), адзначае іх спецыфіку, асобна вылучае паляванне з драпежнымі птушкамі і сабакамі. Найбольшая ўвага надаецца розным прыладам і прыстасаванням, якія выкарыстоўваліся пры паляванні. Казімір Машынскі адзначае, што найбольш старажытная паляўнічая зброя – дубіна – захавалася на Палессі да пачатку ХХ стагоддзя, дзе выкарыстоўвалася дзецьмі падчас палявання на дзікіх качак [19, с. 46 – 47].

У наступных падраздзелах разглядаецца бортніцтва (пераважна на беларускім матэрыяле), аналізуюцца звесткі пра разнастайныя натуральныя фарбавальнікі, выраб расліннага клею, разгледжаны лесахімічныя промыслы (смалакурэнне, выраб дзёгцю).

Такім чынам, польская этналогія 1920 – 1930 гадоў мела важную ролю ў навуковым вывучэнні традыцыйнай гаспадарчай дзейнасці беларусаў у цэлым і культуры лесакарыстання ў прыватнасці.

Паралельна з працэсам дзяржаўнага будаўніцтва ў 1920-я – першай палове 1930-х гадоў адбывалася станаўленне прыярытэтных накірункаў савецкай навукі. Асаблівую актуальнасць набываюць даследаванні ў сферы лесазнаўства, што было абумоўлена, па-першае, агульнай актывізацыяй навуковай дзейнасці ў краіне, па-другое, імкненнем дзяржаўнага кіраўніцтва ўпарадкаваць сістэму лясной гаспадаркі для далейшай інтэнсіўнай і ў той жа час рацыянальнай распрацоўкі лясных багаццяў (у першую чаргу драўніны), і па-трэцяе, для захавання і аднаўлення ляснога фонду дзяржавы. У гэты перыяд з'яўляюцца кнігі і брашуры, якія закранаюць пытанні лесакарыстання ў Беларусі, Я. Седашава [20 – 23], Е.П. Міхасенкі [24; 25], В.І. Перахода [26]. У сваіх працах аўтары, як правіла, звязваюць значнае памяншэнне ляснога фонду Беларусі з драпежніцкім лесанарыхтоўкамі дарэвалюцыйнага часу: "былыя прыватныя ўласнікі старанна выціскалі з лясной маёмасці апошнія сокі" [22, с. 3], з першай сусветнай і грамадзянскай войнамі, паліўным крызісам, а таксама падкрэсліваюць, што прычынай скарачэння лясных масіваў паслужыла нядбайнае і нічым не абмежаванае выкарыстанне лесу сялянствам. У сувязі з гэтым у многіх працах таго часу, якія скіраваны на папулярызацыю і распаўсюджанне інфармацыі аб лесе сярод шырокіх колаў насельніцтва, гучыць заклік да ашчаднага і рацыянальнага выкарыстання лясных багаццяў: "Калгаснікі! Шануйце-ж, ахоўвайце лес, бо лес – прыяцель усіх людзей у іх жыцці, – будзьце-ж і вы яго прыяцелем. Больш увагі лесу і лясной гаспадарцы!" [24, с. 32]. Сярод выданняў, у якіх разглядаўся агульны стан ляснога фонду Беларусі (яе ўсходняй частцы), трэба адзначыць працу "Лесные грузовые фонды Западного края" [27], якая была падрыхтавана ў 1926 годзе і ўтрымлівала інфармацыю аб пабочных карыстаннях і лясных правапарушэннях у колькасных паказчыках.

Пэўную цікавасць для вывучэння збіральніцтва прадстаўляюць даследаванні па батаніцы. У пазначаны перыяд з'яўляецца шэраг прац па мікалогіі Беларусі: Ф.Ф. Захарыч "Збор і загатоўка грыбоў" (1931), В.Ф. Купрэвіч "Страўныя, атрутныя і падазроныя грыбы" (1930), "Грыбы Смалявіцкая раёна" (1931), "Інструкцыі па вывучэнню і выкарыстанню страўных грыбоў і грыбных угоддзяў" (1932), В. Чэмелаў "Харчовыя грыбы і іх выкарыстанне" (1931).

***Трэці этап*** вывучэння традыцый лесакарыстання ахоплівае ***40 – 80-я гады XX стагоддзя***. Цэнтральнай тэмай савецкай этнаграфіі пасляваеннага перыяду была матэрыяльная культура. Аднак вывучэнню традыцыйнай культуры лесакарыстання беларусаў, як і раней, не надавалася патрэбнай увагі. Важнай падзеяй стала выданне прац, прысвечаных асобным відам промыслаў, звязаных з лясной прасторай, – бортніцтву і паляванню.

Як і ў папярэдні перыяд, у 1940 – 1980-я гады з'яўляюцца выданні, скіраваныя на вырашэнне практычных пытанняў выкарыстання лясных рэсурсаў насельніцтвам. Да іх адносяцца брашуры з рэкамендацыямі па нарыхтоўцы грыбоў і ягад "Што павінен ведаць грыбавар і загатавіцель дзікарастучых пладоў, ягад і грыбоў" [28] і "Каляндар дзікарастучых культур" [29], якія выйшлі ў 1945 годзе.

Значэнне і асаблівасці выкарыстання лясной прасторы беларускім насельніцтвам у экстрымальных умовах (на прыкладзе другой сусветнай вайны) асвятляецца ў працы А.І. Залескага "Быт беларускіх сялян у партызанскім краі" (1960) [30]. У раздзеле "Жыхарства сялян у лесе" змешчана апісанне лясных пасяленняў, віды жылля (буданы, зямлянкі) і тэхналогія іх пабудовы, агульныя ўмовы жыцця сялян у лесе. Аднак характарызуючы ежу і стан харчавання сельскага насельніцтва, аўтар фактычна не разглядае пытанні выкарыстання прадуктаў расліннага і жывёльнага паходжання, якія даваў лес.

Некаторыя звесткі адносна народнага лесакарыстання змяшчае манаграфія Л.А. Малчанавай "Материальная культура белорусов" (1968). У падраздзеле "Стан сялянскай жывёлагадоўлі" аўтар распавядае пра актыўнае выкарыстанне лясной пашы на Палессі: "Пасвілі коней звычайна па дубровах, ліставых лясах…" [31, с. 53]. Невялікая па аб'ёме інфармацыя пра гаспадарчыя заняткі, звязаныя з лесам, і посуд, які выкарыстоўваецца для збіральніцтва, сустракаецца ў раздзеле "Ежа і хатнія рэчы".

Фактычна адзінай працай пасляваеннай савецкай этнаграфіі, у якой разглядалася прафесійная прамысловая магія, стала кніга Л.І. Мінько "Суеверия и приметы" (1975) [32].

Характарыстыка прамысловых прылад, у тым ліку прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў паляўніцтве, бортніцтве і калодным пчалярстве, змешчана ў кнізе "Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання" (1981) [33]. Разам з дэтальнымі апісаннямі спецыяльных прылад і прыстасаванняў змешчаны схемы і фотаздымкі, вызначаецца функцыянальнае прызначэнне прадметаў.

Пытанні гісторыі ўзнікнення і развіцця бортніцтва, тэхналагічныя аспекты бортнай справы, бортныя прыстасаванні і прылады працы, юрыдычныя аспекты бортніцтва разглядаюцца ў кнізе У.С. Гуркова і С.Ф. Цярохіна "Бортничество в Белоруссии", якая выйшла ў 1980 годзе [34]. Трэба адзначыць, што рытуальна-абрадавыя практыкі і міфапаэтычныя ўяўленні, звязаныя з заняткам, у кнізе практычна не разглядаюцца.

Кніга "Занятие издревле благородное" (1987) з'яўляецца лагічным працягам даследаванняў аўтараў у галіне прамысловай дзейнасці беларусаў. Значная частка працы прысвечана бортніцтву (раздзелы "Узнікненне і развіццё бортніцтва", "Канструкцыі (устройства) борці, бортныя прылады і прыстасаванні", "Бортнае права", "Мядовыя брацтвы, бортныя цэхі, мядовая даніна" і інш.). Сярод іншага разглядаецца

этымалогія слова “борць”, асобныя вераванні і звычаі, звязаныя з промыслам, у тым ліку звязаныя з працэсам “тварбы” – прываблівання ў борць пчол: “Што толькі не спрабавалі яны: варылі розныя травы і карэнні, дабаўлялі ў сыту жоўць шчупака, парашок з высушаных і вытаўчаных костак кажаноў, змяінай скуры, ікры рака, бабровую струю, памёт цецерука” [35, с. 30]. У дужках прыводзяцца беларускія народныя найменні некаторых спецыяльных тэрмінаў.

Характарыстыку лясных, лесахімічных і дрэваапрацоўчых промыслаў і рамёстваў беларусаў змяшчае дысертацыйнае даследаванне Н.І. Буракоўскай [36]. Фактычна ўпершыню ў айчыннай навуцы робіцца спроба этнаграфічнага аналізу лясных (збіральніцтва, лесанарыхтоўка, нарыхтоўка сыравіны) і лесахімічных (смалакурэнне, гонка дзёгцю і шкіпінару, выпальванне вугалю, выварка паташу) промыслаў. Звяртаецца ўвага на класіфікацыю і сістэматызацыю прамысловых заняткаў, тэхналагічныя пытанні промыславай дзейнасці, выяўляецца яе этнічная спецыфіка, агульныя рысы і лакальныя асаблівасці, аднак гістарычныя рамкі працы Н.І. Буракоўскай абмяжоўваюцца канцом XVIII – XIX стагоддзем.

У працы “Охота в Белоруссии” (1986) С.Ф. Цярохін падрабязна спыняецца на гісторыі ўзнікнення і развіцця промысла, апісвае тэхналагічныя аспекты справы, у тым ліку спецыяльныя прыстасаванні і прылады, звяртае ўвагу на юрыдычныя аспекты занятку. Аўтар пазначае, што “паляванне як ніякі іншы занятак чалавека, абцяжараны шматлікімі абсурднымі забабонамі” [37, с. 48], прыводзіць некалькі прыкладаў паляўнічых павер’яў. Разам з тым у працах У.С. Гуркова і С.Ф. Цярохіна, прысвечаным асобным відам промыслаў – бортніцтву, пчалярству і паляванню, прамысловая магія практычна не разглядалася.

У абагульняючым даследаванні “Материальная культура Полесья” (1988) [38] асвятляюцца асноўныя кампаненты традыцыйнай побытавай культуры палешукоў, у тым ліку традыцыйныя рамёслы і промыслы. У раздзеле, прысвечаным дапаможным заняткам, разглядаюцца паляўніцтва [38, с. 155 – 164], пчалярства [38, с. 164 – 173] і збіральніцтва [38, с. 173 – 177]. Лясныя [38, с. 236 – 245] і лесахімічныя промыслы [38, с. 245 – 253] змяшчаюцца ў раздзеле “Народныя промыслы і рамёствы”. Адметнасць дадзенай працы – вызначэнне рэгіянальных асаблівасцяў матэрыяльнай культуры вызначанага арэала, а таксама этнакультурных зменаў, якія адбыліся ў сферы гаспадарчай дзейнасці і побыту насельніцтва Палесся ў XX стагоддзі.

Асобныя аспекты культуры лесакарыстання беларусаў прадстаўлены ў энцыклапедыі “Этнаграфія Беларусі” (1989) артыкуламі: “Паляванне” [39, с. 379 – 380]; “Паляўнічая зброя” [39, с. 383 – 384]; “Лесахімічныя промыслы” [39, с. 388 – 389]; “Смалакурня” [39, с. 470], “Паташ” [39, с. 392]; “Бортніцтва” [39, с. 83 – 84]; “Бортнае знамя” [39, с. 83]; “Пасека” [39, с. 391]; “Збіральніцтва” [39, с. 209 – 210].

***Чацверты этап – 90-я гады XX – пачатак XXI стагоддзя.*** У гэты перыяд ізноў абуджаецца цікавасць да рознапланавых аспектаў духоўнай культуры беларусаў, з’яўляецца шэраг прац, якія адлюстроўваюць месца і ролю леса ў сістэме светапоглядных уяўленняў беларусаў, а таксама прац па семіётыцы лясной прасторы.

У 1995 годзе пачалося выданне шматтомнага гісторыка-этнаграфічнага даследавання пад агульнай назвай “Беларусы” [40], першы том якога быў прысвечаны народным промыслам і рамёствам. Збіральніцтва разглядаецца першым у шэрагу здабываючых промыслаў. У раздзеле даволі падрабязна характарызуюцца асноўныя віды збіральніцтва, спосабы і тэрміны нарыхтоўкі і захоўвання грыбоў, ягад, арэхаў, дзікарослай садавіны, жалудоў, бярозавага соку, выкарыстанне грыбоў і ягад у якасці лекавых сродкаў, некаторыя міфапаэтычныя ўяўленні аб збіральніцтве, сцісла разглядаюцца гісторыка-юрыдычныя аспекты бытавання промыслу на Беларусі, звяртаецца ўвага на полаўзроставы падзел працы, посуд, узгадваецца роля збіральніцтва ў экстрымальных умовах і інш. Сярод недахопаў адзначым адносна невялікі аб’ём раздзелу, абмежаванасць крыніц, а таксама тое, што ў працы абмінаецца пытанне рытуальна-сімвалічных практык, звязаных са зборам лясных дароў. Інфармацыя, змешчаная ў раздзеле “Паляўніцтва”, фактычна дубліруе выдадзеную раней працу “Охота в Белоруссии” (1986). У кнізе на падставе аналізу шэрагу этнаграфічных матэрыялаў, летапісных крыніц, юрыдычных актаў разглядаюцца гісторыя і прававыя аспекты пчалярскага промыслу, падрабязна апісаны працэс тэхналагічнага ўдасканалення прыладаў пчалярства (борць – калодны вулей – рамачны вулей). У раздзеле “Лесахімічныя промыслы” асвячаюцца пытанні гісторыі і тэхналогіі такіх традыцыйных промыслаў, як смалакурэнне, гонка дзёгцю і шкіпінару, выпальванне вугалю, выварка паташу, вызначаюцца асноўныя цэнтры лесахімічных промыслаў (Падняпроўе і Палессе), апісаны асобныя магічныя прыёмы, што суправаджалі працэс гонкі смалы і інш. Асобны раздзел прысвечаны нарыхтоўцы і сплаву лесу ў Беларусі.

Безумоўна, кніга “Беларусы. Прамысловыя і рамесныя заняткі” мае выключнае значэнне для вывучэння традыцыйнай культуры лесакарыстання беларусаў. Аднак у працы не ў поўнай меры ўлічаны прынцып рэгіянальнасці этнакультурных з’яў. Генезіс прамысловых і рамесных заняткаў разглядаецца ў гістарычнай рэтраспектыве, разам з тым эвалюцыя традыцый лесакарыстання ў другой палове XX стагоддзя, у перыяд дынамічных змен у дзяржаве, грамадстве, навакольным асяроддзі, практычна не разглядаецца.

У вучэбна-метадычным дапаможніку “Этнаграфічная спадчына” (1997) В.С. Цітоў падае класіфікацыю прамысловых заняткаў беларусаў і іх апісанне.

Бадай, першай спробай семіятычнага аналізу архаічных прасторавых структур, адлюстраваных у беларускім фальклоры, стала даследаванне С. Санько "Прасторавыя і часавыя структуры беларускай міфапаэтычнай мадэлі свету" (1998), якое разглядае лес менавіта як элемент ландшафтавага коду традыцыйнай беларускай мадэлі свету, пазначае яго памежныя або медыяльныя функцыі, а таксама яго ролю ў структураванні казачнай эпічнай прасторы, падкрэслівае, што ў беларускай міфалогіі "ўяўленні пра лес як пра добры ці, прынамсі, не безварункава варожы локус", што сустракаецца даволі рэдка ў традыцыйных міфалогіях [41, с. 111 – 113]. Сімвалічны статус лесу ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў характарызуецца ў дысертацыйным даследаванні У.А. Лобача [42].

Карыснымі для вывучэння светапоглядных уяўленняў беларусаў, звязаных з лесам і выкарыстаннем лясных рэсурсаў, з'яўляюцца працы па міфалогіі Беларусі І.Р. Вугліка, А.М. Ненадаўца, У.М. Сівіцкага, А.А. Шамака і інш., а таксама атыкулы ў энцыклапедычных выданнях "Беларуская міфалогія" (2004) і "Беларускі фальклор" (Т. 1 – 2, 2005 – 2006).

Праблемы, звязаныя з вывучэннем дэманалагічных персанажаў, распрацоўкай метадаў параўнальнага вывучэння дэманалогіі розных славянскіх народаў, у тым ліку з выкарыстаннем беларускіх этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, закранаюцца ў працах расійскіх даследчыкаў Т.А. Агапкінай, Л.Н. Вінаградавай, Н.А. Крынічнай, Т.В. Цыўян і інш. Метадалагічную і тэарэтычную каштоўнасць для вывучэння міфапаэтычных уяўленняў беларусаў аб лясной прасторы і выкарыстанні яе рэсурсаў маюць даследаванні расійскіх навукоўцаў А.К. Байбурына, В.У. Іванова, А.Я. Леўкіеўскай, У.Я. Пропа, У.М. Тапарова, С.А. Токарава і інш.

Карыснай крыніцай для вывучэння традыцыйных светапоглядных уяўленняў беларусаў аб лесе і прамысловых занятках, звязаных з лясной прасторай, выступаюць асобныя тамы серыі БНТ: "Замовы" (1992); "Прыказкі і прымаўкі" (1976); "Легенды і паданні" (1983); "Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка" (2007), а таксама сучасныя зборнікі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў: "Народная міфалогія Гомельшчыны" (2003); "Полацкі этнаграфічны зборнік: Народная проза беларусаў" (Ч. 1 – 2, 2011).

Асобна адзначым кнігі па батаніцы (этнабатаніцы), якія датычуць праблемы этнакультурных аспектаў збіральніцтва. Да іх адносіцца тэматычны слоўнік "Раслінны свет" (2001) [43]. Кніга дае магчымасць прасачыць варыятыўнасць лакальных назваў раслін Беларусі. Грыбам Беларусі прысвечана праца Г.І. Сяржанінай і І.Я. Яшкіна "Грыбы і грыбная кулінарыя" (2005) [44]. Адметнасць кнігі, у параўнанні з іншымі даследаваннямі па мікалогіі Беларусі, – наяўнасць мовазнаўчых матэрыялаў. Акрамя таго, аўтары спрабуюць увесці новыя назвы для грыбоў, якія, па іх меркаванні, адпавядаюць галоўнай адзнацы віда і моўным нацыянальным асаблівасцям (напрыклад, баравік – глызнік, абабак – гаёвік). Для кожнага грыба прапануецца і навуковая назва, аналітычна абгрунтаваная, сугучная з міжнароднай (лацінскай) і агульнапрынятай рускай назваю, а таксама мясцовыя варыянты назвы (прыведзена больш за 2500 народных грыбных найменняў). Кніга ўключае раздзелы "З гісторыі асваення і вывучэння грыбоў на Беларусі", "З аналізу народнай грыбной наменклатуры і лінгвагеаграфічных матэрыялаў", "Грыбы ў традыцыйнай беларускай кухні", дадаткі "Размяшчэнне грыбовішчаў на Беларусі ў XIX – XX стст.","Грыбы ў беларускім фальклоры".

На эвалюцыю традыцыйнай культуры лесакарыстання безумоўна ўплывала палітыка ўладаў у сферы лясной гаспадаркі і ляснога заканадаўства. У сувязі з гэтым пэўную цікавасць маюць даследаванні, якія адлюстроўваюць асаблівасці ляснога права напрацягу XX – пачатку XXI стагоддзя [45 – 47], а таксама нарматыўныя прававыя акты ляснога заканадаўства (кодэксы, пастановы, інструкцыі і інш.).

Вынікам шматгадовых даследаванняў, праведзеных у Інстытуце леса, стала абагульняючая праца "Лесопользование в Беларуси: История, современное состояние, проблемы и перспективы" (1996) [48], дзе сцісла апісана гісторыя лесакарыстання ад старажытнасці да сённяшняга часу, прадстаўлена дэтальная характарыстыка ляснога фонду рэспублікі.

Пры вывучэнні гісторыі паляўніцтва ў Беларусі, этнакультурных асаблівасцяў дадзенага занятку нельга абмінуць увагай кнігі, прысвечаныя Белавежскай пушчы, аўтараў Г. Карцава (1902) і В.В. Семакова (2002).

Метадалагічную каштоўнасць для вывучэння традыцый лесакарыстання маюць працы па этнаэкалогіі расійскіх і ўкраінскіх аўтараў (М. Марохін, У. Барэйка, В. Захарава, Д. Даронін). Падыходы этнічнай экалогіі, дзе ўвага даследчыка канцэнтруецца на развіцці і функцыянаванні сістэм жыццязабеспячэння чалавечых калектываў і спосабаў адаптацыі да прыроднага і сацыякультурнага асяроддзя, былі распрацаваныя В.І. Казловым ("Этническая экология: становление дисциплины и история проблемы", 1994).

**Заключэнне.** Можна канстатаваць, што ў беларускай этналогіі назапашаны значны фактычны матэрыял па тэме традыцыйнага лесакарыстання беларусаў. З'явіліся асобныя даследаванні аналітычнага характару, якія разглядаюць такія віды промыслаў, звязаных з лесам, як бортніцтва і паляванне. Важнае значэнне мае праца "Беларусы: Промыслы і рамёствы", у якой побач з іншымі відамі прамысловых заняткаў беларусаў, прадстаўлены і асноўныя этнакультурныя формы лесакарыстання.

Агляд літаратуры паказаў, што ў вывучэнні дадзенай праблемы маюцца яшчэ значныя прабелы. Так, недастаткова даследавана ступень захаванасці і асаблівасці трансфармацыі міфапаэтычных уяўленняў беларусаў, звязаных з лясной прасторай; змены ў бытаванні традыцыйных форм лесакарыстання беларусаў, якія адбыліся напрацягу XX – пачатку XXI стагоддзя; рэгіянальныя асаблівасці выкарыстання

рэсурсаў лесу. Акрамя гэтага, традыцыі культуры лесакарыстання беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя дагэтуль не былі аб'ектам спецыяльнага даследавання.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларусы: у 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, А.І. Лакотка. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 365 с.
2. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1902. – Т. 3. – 596 с.
3. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А.Е. Богданович. – М.: ИЦ «Слава!» ООО «Форт-Профи», 2009. – 160 с. (воспроизведение издания 1895 г.).
4. Россия: Полное географическое описание нашего Отечества. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия / под ред. В.П. Семенова. – СПб.: Изд. А.Ф. Девриена, 1905. – 620 с.
5. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. тип., 1895. – 552 с.
6. Никифоровский, Н. Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Никифоровский // Виленский временник. Вильна: Изд. Виленского Генерал-Губернаторского управления, 1907. – Кн. 2. – С. 3 – 103.
7. Сержпутовский, А.К. Бортничество в Белоруссии / А.К. Сержпутовский // Материалы по этнографии России: в 2 т.; этногр. отд. Рус. музея имп. Александра III; под ред. Ф.К. Волкова. – М., 1910 – 1914. – Т. 2. – 1914. – С. 13 – 34.
8. Хозяйственное положение и промыслы сельского населения Витебской губернии / Стат. отд-ние Витеб. губерн. управы по делам зем. хоз-ва. – Витебск: Губерн. тип., 1910. – 123 с.
9. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Быт белоруса / Е.Р. Романов. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1912. – VIII, 600 с.
10. Могилёвская старина / под ред. Е.Р. Романова. Вып. 3. Годы 1902 – 1903. – 1903. – 127 с. (Могилёвская старина. Сб. ст. “Могилёвских губернских ведомостей” / под ред. Е.Р. Романова, Вып. 3. – Могилёв на Днепре, 1903: Тип. губерн. правления).
11. Добровольский, В.Н. Нечистая сила в народных верованиях / В.Н. Добровольский // Живая старина, 1908. – Вып. I. – С. 49 – 74.
12. Szukiewicz, W. Werzenia i praktyki ludowe / W. Szukiewicz // Wisla. – 1903. – T. XVII. – Zesz. 4. – S. 431 – 444.
13. Міхайлец, М.А. Польская этналогія XIX – першай паловы XX стагоддзя аб матэрыяльнай культуры беларусаў / М.А. Міхайлец. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 146 с.
14. Сержпутоўскі, А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. Сержпутовскі; Беларус. акад. навук. Аддз. гуманіт. навук. – Мінск, 1930. – 284 с.
15. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне. Матэрыяльная культура / І.А. Сербаў. – Мінск: Беларускі фонд культуры, 2005. – 78 с. (перавыданне 1928 г.).
16. Pietkiewicz, Cz. Polesia Rzeczyckie. Kultura materialna / Cz. Pietkiewicz // Prace Komisiji Etnograficznej Polskiej Akademii Umiejetnosci. – Kraków, 1928. – № 7. – 319 s.
17. Pietkiewicz, Cz. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materjaly etnograficzne / Cz. Pietkiewicz. – Warszawa: Tow-wo naukowe Warszawskie, 1938. – 459 s.
18. Moszynski, K. Polesie Wschodnie / K. Moszynski. – Warszawa: Wyd-wo Kasy im. Mianowskoego, 1928. – 328 s.
19. Moszynski, K. Kultura ludowa slowian: 2 cz. / K. Moszynski. – wyd. 2. – Warszawa: Książka i wiedza, 1967. – Cz. 1: Kultura materialna. – 754 s.
20. Седашев, Я.Н. Лесное хозяйство в Белорусской Советской Социалистической Республике. – Минск: Нар. ком. землед. ССРБ, 1923. – 15 с.
21. Седашев, Я.Н. Отпуск леса трудовому населению в Советской Социалистической Республике / Я.Н. Седашев. – Минск: Изд. Упр. лесами Наркомзема БССР, 1925. – 50 с.
22. Седашев, Я.Н. Богата ли Белоруссия лесам? / Я.Н. Седашев. – Гомель: Тип. «Полеспечать», 1928. – 16 с.
23. Седашоў, Я. Пасьба скаціны ў лесе / Я. Седашоў. – Мінск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – (Сялянская бібліятэка). – 48 с.
24. Міхасенка, Е.П. Што дае лес калектыўнай сельскай гаспадарцы / Е.П. Міхасенка. – Мінск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1930. – 32 с.
25. Міхасенка, Е.П. Як арганізаваць “Дзень лесу” / Е.П. Міхасенка. – Мінск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 36 с.
26. Переход, В.И. Леса и лесное хозяйство БССР: краткий очерк / В.И. Переход; под ред. З.С. Каценбогена, В. Шульмана, И.А. Петровича. – Мінск: Изд. СНК БССР, 1925. – Библиограф.: С. 50 – 519 (36 назв.).
27. Лесные грузовые фонды Западного края / Нар. комиссариат путей сообщения. – Смоленск: Изд. Упр. Зап. район. ком. по регулированию перевозок, 1926. – 177 с.

28. Захарыч, Ф.Ф. Што павінен ведаць грыбавар і загатавіцель дзікарастучых пладоў, ягад і грыбоў / Ф.Ф. Захарыч (Старшы навуковы работнік Батанічнага сада). – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1945.
29. Захарыч, Ф.Ф. Каляндар дзікарастучых культур БССР / Ф.Ф. Захарыч. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1945.
30. Залескі, А.І. Быт беларускіх сялян у партызанскім краі / А.І. Залескі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1960. – 211 с.
31. Молчанова, Л.А. Материальная культура белорусов / Л.А. Молчанова. – Минск: Наука и техника, 1968. – 231 с.
32. Минько, Л.И. Суеверия и приметы (истоки и сущность) / Л.И. Минько. – Минск: Наука и техника, 1975. – 192 с.
33. Браим, И.Н. Промысловые орудия и ремесленные изделия как памятники материальной культуры / И.Н. Барим; Белорус. добровольное о-во охраны памятников истории и культуры, Бюро пропаганды. – Минск: Полымя, 1976. – 24 с.
34. Гурков, В.С. Бортничество в Белоруссии / В.С. Гурков, С.Ф. Терёхин. – Минск: Полымя, 1980. – 32 с.
35. Гурков, В.С. Занятие издревле благородное: [О равитии пчеловодства в Белоруссии] / В.С. Гурков, С.Ф. Терёхин. – Минск: Полымя, 1987. – 137 с.
36. Бураковская, Н.И. Промысла и ремёсла белорусов в период разложения феодализма и утверждения капитализма (к. XVIII – XIX в.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / Н.И. Бураковская; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1982. – 23 с.
37. Терёхин, С.Ф. Охота в Белоруссии / С.Ф. Терёхин. – Минск: Полымя, 1986. – 160 с.
38. Полесье. Материальная культура / В.К. Бондарчик [и др.]; редкол.: В.К. Бондарчик, Р.Ф. Кирчив (отв. ред.); АН УССР. Львовское отд-е Ин-та искусствовед., фольклора и этнографии им. М.Ф. Рыльского. – Киев: Наукова думка, 1988. – 448 с.
39. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.); рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.
40. Беларусы: у 8 т. / рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, В.С. Цітоў. – Мінск: Навука и тэхніка, 1995. – Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі. – 351 с.
41. Санько, С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі / С. Санько. – Менск: БГАКЦ, 1998. – 190 с.
42. Лобач, У.А. Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач. XX ст.): аўтарэф. … канд. гіст. навук / У.А. Лобач. – Мінск, 2003. – 20 с.
43. Раслінны свет: Тэматычны слоўнік / склад. В.Дз. Астрэйка [і інш.]; навук. рэд. Л.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 655 с.
44. Сяржаніна, Г.І. Грыбы і грыбная кулінарыя: папул. энцыкл. давед. / Галіна Сяржаніна, Іван Яшкін. – Мінск: Беларус. асац. кулінараў, 2005. – 392 с.
45. Лаевская, Е.В. Организационно-правовое обеспечение охраны лесов в Республике Беларусь: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.00.06 / Е.В. Лаевская; Моск. юрид. акад. – М., 1994. – 23 с.
46. Ермолинский, П.М. Лесное право Республики Беларусь / П.М. Ермолинский. – Минск: Тесей, 2007. – 248 с.
47. Дембо, Л.И. Правовой режим лесов в свете сталинского плана преобразования природы / Л.И. Дембо. – Л.: Изд-во ЛГУ, 1951. – 64 с.
48. Багинский, В.Ф. Лесопользование в Беларуси: История, современное состояние, проблемы и перспективы / В.Ф. Багинский, Л.Д. Есимчик. – Минск: Беларус. навука, 1996. – 367 с.

*Паступіў 16.06.2011*

**TRADITIONAL FOREST USING CULTURE OF BELARUSIANS IN THE 20 – EARLY 21 CENTURY: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM**

***A. BABICH***

*Based on consideration of a number of ethnographic works, as well as research on folklore, ethno botany, forestry, etc., the author identifies the main stages and trends in the study of the problem. Belarusian ethnology has accumulated a wealth of factual material on traditional forest using culture of Belarusians. In XX – early XXI century number of monographs, articles on the characteristics of the crafts of Belarusians appeared. They reflect issues related to ethno-cultural aspects of forest using. There are works, revealing the ideological representation of the Belarusian space of the forest. Urgency of historiographical study cultural traditions in the Belarusian forest XX – early XXI century is to summarize the information base on the topic, as well as further study and theoretical understanding of the problem.*